5. Поздеева, Т. В. Компетентностный подход в подготовке специалистов системы дошкольного образования / Т. В. Поздеева. // Репозиторий БГПУ [Электронный ресурс].— 2015.— Режим доступа: http://elib.bspu.by/.— Дата доступа: 26.01.2018.

6. Ракова, Е. Детская литература и ее специфика / Е. Ракова // Международный образовательный портал [Электронный ресурс].— 2015.— Режим доступа: http://www.maam.ru/detskijsad/detskaja-literatura-i-e-specifika.html.— Дата доступа: 13.11.2017.

7. Степанова, А. С. Дидактические игры в педагогическом процессе / А. С. Степанова // VIII Международная студенческая электронная научная конференция «Студенческий научный форум» [Электронный ресурс].— 2016.— Режим доступа: https://scienceforum.ru/.— Дата доступа: 20.12.2017.

8. Толкачева, Е. Т. Становление начал ключевых компетентностей у детей дошкольного возраста // Социальная сеть работников образования [Электронный ресурс].— 2018.— Режим доступа: https://nsportal.ru/detskiy-sad/raznoe/2018/01/22/stanovlenie-nachal-klyuchevyh-kompetentnostey-u-detey-doshkolnogo.— Дата доступа: 26.01.2018.

9. Художественная парадигма русской детской литературы конца XIX — начала XX века // Учебная программа спецкурса для специальности 1-21 05 02 «Русская филология» [Электронный ресурс].— 2008.— Режим доступа: http://www.philology.bsu.by.— Дата доступа: 12.12.2017.

УДК 739(091):069.1(476.5-21)

# ФРАГМЕНТЫ КІВОТНАГА КРЫЖА ПАЧ. XIII СТ. З МУЗЕЙНЫХ ЗБОРАЎ НПГКМЗ

*Магалінскі І. У.*

*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*старшы навуковы супрацоўнік навукова-рэстаўрацыйнага аддзела НПГКМЗ*

Важнай катэгорыяй вырабаў з каляровых металаў з'яўляюцца прадметы хрысціянскага культу. Яны не толькі маркіравалі прыналежнасць да той ці іншай хрысціянскай канфесіі, але і з'яўляліся выдатнымі ўзорамі ювелірнага рамяства. Хрысціянская металапластыка ў калекцыі археалагічных артэфактаў з Полацка прадстаўлена масавымі і індывідуальнымі знаходкамі. Да групы масавых можна аднесці знаходкі крыжоў-цельнікаў розных тыпаў. Рэдкія артэфакты прадстаўлены крыжамі-энкалпіёнамі і іх фрагментамі, абразкамі, элементамі царкоўнага аздаблення і інш.




*Малюнак. Фрагменты ківотнага крыжа пач. XIII ст. з музейных збораў НПГКМЗ*

Сярод рэдкіх прадметаў хрысціянскага культу, выяўленых падчас археалагічнага вывучэння Полацка, вялікую цікавасць выклікаюць два фрагменты ківотнага крыжа, якія з'яўляюцца ўнікальнымі для тэрыторыі Беларусі ўзорамі візантыйска-кіеўскай хрысціянскай металапластыкі пачатку XIII ст.

Ківотныя крыжы адрозніваюцца ад нагрудных сваімі большымі памерамі і адсутнасцю вушка для падвешвання. Дадзеныя вырабы часцей за ўсё ставілі ў чырвоны кут і размяшчалі сярод ікон, а таксама прымацоўвалі да дзвярэй. Іх бралі ў вандроўкі і выкарыстоўвалі для арганізацыі часовых алтароў [1, с. 21; 2, с. 4].

Дэталі ківотнага крыжа былі выяўлены ў Полацку ў ходзе археалагічных даследаванняў 2007 г. на тэрыторыі першапачатковага Гарадзішча (кіраўнік — Д. У. Дук). Раскоп меў памеры 11×4 *м* і быў арыентаваны доўгім бокам практычна па накірунку захад-усход. Па шэрагу прычын раскоп быў не даведзены да мацерыка па ўсёй плошчы. У ходзе прац была выяўлена вялікая калекцыя індывідуальных знаходак, якая налічвала 496 пазіцый. Сярод артэфактаў былі сустрэты статусныя рэчы ўнікальных для Беларусі тыпаў, да групы якіх адносяцца знаходкі двух фрагментаў ківотнага крыжа. Прадметы знойдзены ў слаях XII—XIII стст. [3, с. 35; 4, с. 119].

Фрагменты крыжа, выяўленыя на полацкім гарадзішчы, прадстаўлены літымі бронзавымі барэльефнымі фігуркамі Прадстаячай Багародзіцы і Іаана Багаслова (*малюнак)*. Выявы прадстаячых адліты з алавяна-свінцовай бронзы з нізкай канцэнтрацыяй волава ў аднабаковай ліцейнай форме.

Гэты сплаў мае добрыя ліцейныя якасці, а таксама вылучаецца шчыльнасцю атрыманых адлівак. Пераважнае выкарыстанне для вытворчасці прадметаў хрысціянскага культу алавяна-свінцовай і свінцовай бронзы ў цэлым характэрна для тэрыторыі Паўночна-Заходняй Русі і Беларусі [5, с. 249; 6, с. 328].

Фігура Прадстаячай Багародзіцы выканана вельмі якасна, з вялікай увагай да дэталяў адзення і абрысаў твару. У выявы Іаана Багаслова страчана частка галавы, а агульныя абрысы фігуры не такія выразныя. На нашу

думку, гэтыя адметнасці трэба звязваць з бракам адліўкі. Магчыма, менавіта ў сувязі з гэтым фігурка Іаана Багаслова адсутнічае на ўсіх вядомых экзэмплярах крыжоў дадзенага тыпу.

Разважаючы пра паходжанне прадметаў, аўтар знаходкі Д. У. Дук не выключыў магчымасці вытворчасці дадзеных прадметаў на тэрыторыі Полацка мясцовымі ювелірамі, на што ўказваюць знаходкі фрагментаў тигляў у раскопе [4, с. 119].

Знаходкі крыжоў дадзенага тыпу адзінкавыя на старажытнарускай тэрыторыі і пераважна канцэнтруюцца на яе паўднёвай частцы. Практычна поўнасцю захаваныя экзэмпляры паходзяць з даследаванняў у Херсанесе (сучасны Севастопаль) і Судаку [7, с. 165]. Яшчэ два фрагменты падобных крыжоў былі знойдзены на тэрыторыі Кіеўшчыны [8, с. 11].

На думку В. Г. Пуцко, крыж з Судака ўяўляе сабой пераадліўку з арыгінальнага прадмета, на што ўказвае шэраг прыкмет. Па меркаванні таго ж даследчыка, херсанескі крыж з'яўляецца арыгінальным вырабам, які паходзіць з кіеўскай майстэрні візантыйскага майстра. Абодва прадметы датуюцца пачаткам XIII ст. [7, с. 165].

Такім чынам, фрагменты ківотнага крыжа, якія былі знойдзеныя на тэрыторыі старажытнага Полацкага гарадзішча ў 2007 г., з'яўляюцца ўнікальным для тэрыторыі сучаснай Беларусі прыкладам хрысціянскай металапластыкі пачатку XIII ст.

На нашу думку, полацкія знаходкі маюць усе прыкметы вытворчасці іх у адной кіеўскай майстэрні візантыйскага майстра, што і крыж з Херсанеса (Севастопаля). Выяўленне ў Полацку артэфакта выразнага паўднёварускага паходжання яшчэ раз пацвярджае існаванне цеснай сувязі Полацка з тэрыторыяй Кіеўшчыны на працягу XIII—XIV стст. Гэты факт пацвярджаецца і іншымі прадметамі элітарнай культуры, знойдзенымі ў апошнія гады на тэрыторыі горада (амулеты-змеявікі і інш.).

## Спіс літаратуры і крыніц

1. Гнутова, С. В. Кресты, иконы, складни. Медное художественное литьё XI — начала XX вв. из собрания центрального музея древнерусской культуры и искусства им. Андрея Рублёва / С. В. Гнутова, Е. Я. Зотова.— М.: Интербук-бизнес, 2000.— 135 с.
2. Стерлигова, И. А. Киотный крест из Херсонесского музея и русские меднолитые киотные кресты XII—XIV вв. / И. А. Стерлигова // Древнерусская скульптура. Проблемы и атрибуции. Вып. 2.— М., 1993.— Ч. II.— С. 4—19.
3. Дук, Д. У. Археалагічныя раскопкі на старажытным полацкім гарадзішчы ў 2007 г. / Д. У. Дук // Матэрыялы па археалогіі Беларусі.— Мінск, 2011.—